УДК 808.26 – 313.1(043.3)

**В. В. Шур**
Доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай і рускай філалогіі,
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

# ТЫПОВЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ПРОЗВІШЧЫ З ФАРМАНТАМІ *-ОВІЧ/-ЕВІЧ* ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ АНТРАПАНІМІІ: ЛІНГВІСТЫЧНЫ І КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТЫ

*У артыкуле прасочаны этапы фармавання тыповага для беларускай антрапаніміі прозвішча* ***Станкевіч****, што надзвычай актуальна не толькі ў генеалагічным, а і ў лінгвакультуралагічным аспектах. Растлумачана яго паходжанне, словаўтварэнне, лінгвагеаграфічныя асаблівасці, культуралагічныя адметнасці, названы асобы з гэтым прозвішчам, якія ўнеслі значны ўклад у навуку, асвету, вайсковую справу.*

*Ключавыя словы: онім, антрапонім, прозвішча, уласнае імя, фармант, анамастычны суфікс.*

## Уводзіны

Беларускія прозвішчы даследаваны даволі падрабязна. Лінгвістамі прааналізавана і растлумачана паходжанне, спосаб утварэння, тэрытарыяльная прыналежнасць больш за 56 тысяч такіх антрапонімаў (працы М. Бірылы, М. Грынблата, Г. Усціновіч, Г. Мезенка, Ю. Гурскай, А. Каўруса, А. Ванагаса, В. Рымшы, В. Рагаўцова, У. Бобрыка, У. Лякіна, Ф. Янкоўскага, І. Лепешава, В. Лемцюговай, В. Ляшчынскай, Г. Семяньковай, П. Сцяцко, А. Станкевіч, У. Юрэвіча, І. Шумскай, А. Шатун і інш.).

## Вынікі даследавання і іх абмеркаванне

Утварэнне прозвішчаў ва ўсходніх славян, як прасачылі М. Бірыла і У. Ніканаў, дакладна дыферэнцыявана ў адпаведнасці з сацыяльным становішчам. Працэс іх станаўлення ў беларусаў працягваўся больш за 6 стагоддзяў: у князёў і баяраў яны сфарміраваліся ў XIV–XVI стст., у дваран, шляхты – у XV–XVII стст., у купцоў – у XVII–XIX стст., у сялян – у XVIII–XIX стст., а ў некаторых народаў былога СССР – у савецкі перыяд. Асноўнай падставай юрыдычнага замацавання прозвішча за пэўнай асобай з'яўляецца абавязковая дакладная ідэнтыфікацыя, якая выдзяляе чалавека ў грамадстве, а таксама вызначае прыналежнасць яго (індывідуума) да пэўнай сям'і, да пэўнага роду, саслоўя.

Беларусы першымі з усходніх славян, як сведчаць навуковыя крыніцы, набылі прозвішчы. У наш час у Беларусі з 2011 года па ініцыятыве Анатоля Статкевіча-Чабаганава пачаў выдавацца *“Летапіс беларускай шляхты”*. Першы том выйшаў у свет пад назвай “*Я – сын Ваш: Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба “Касцеша”. Карафа-Корбуты герба “Корчак*”. Апублікавана ўжо пяць тамоў гэтай серыі, што прысвечаны гісторыі беларускіх родаў ад найстаражытнейшых часоў да нашых дзён. Гэтыя кнігі набылі добрую славу не толькі сярод вучоных, якія спецыялізуюцца ў сферы беларускай генеалогіі, архівістаў, даследчыкаў індывідуальна-сямейна-родавых сувязяў, але і сярод іншых прадстаўнікоў грамадства. На навуковую і патрыятычную вартасць такіх прац звярталі ўвагу ў сваіх выступленнях Мітрапаліт *Філарэт*, а таксама Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік *Уладзімір Гусакоў*, асабліва падкрэсліваючы выключна выхаваўчую і пазнавальную вартасць прац А. Статкевіча-Чабаганава: “У нашы дні генеалагічныя даследаванні выклікаюць жывую цікавасць у грамадстве. Многія людзі імкнуцца даведацца пра мінулае сваіх родаў, сваіх прозвішчаў. Гісторыя вельмі неахвотна адкрывае свае старонкі. І толькі дзякуючы настойлівым намаганням спецыялістаў, іх вялікай даследчай працы вяртаюцца тысячы забытых імёнаў нашых суайчыннікаў” [1, 85–87].

Пісьменнік Уладзімір Ліпскі, напрыклад, напісаў некалькі кніжак пра свой радавод, сваю вёску, сваіх землякоў. У кнізе “Аповесць пра нашы прозвішчы” ён рытарычна задаў сабе пытанне: *“Адкуль жа з'явіліся ліпавыя, лапцюжныя Ліпскія ў вёсцы Шоўкавічы? Хто яны? Якога роду-племені?”.* Адказ на такое пытанне – гэта некалькі соцень старонак у некалькіх яго мастацкіх

© Шур В. В., 2017

МГПУ им. И.П. Шамякина

кніжках, якія з цікавасцю чытаюцца не толькі аматарамі, а і прафесіяналамі-этнографамі, гісторыкамі, лінгвістамі, краяведамі.

Вывучэнне сваёй радаслоўнай не толькі ў генеалагічным, а і ў лінгвакультуралагічным аспектах дае магчымасць носьбіту прозвішча па-новаму паглядзець на свае карані, у пошуках якіх у наш час і фарміруецца наша грамадская свядомасць, ажыццяўляецца паварот да агульначалавечых каштоўнасцяў. Безумоўна, веданне гісторыі свайго прозвішча важна і карысна і сацыяльнымі вынікамі: яно ў пэўнай меры забяспечвае грамадству стабільнасць і пераемнасць у генетычным развіцці нацыі, лепшымі прадстаўнікамі якой у беларускім грамадстве па праву лічылася шляхта, якая ў савецкі перыяд незаслужана часцей ганьбавалася, прыніжалася. Нас, беларусаў, лічылі сялянскай нацыяй. Дзякуючы такім працам мы вяртаем з небыцця беларускую шляхту, якой, нібыта па волі палітыкаў савецкіх часоў, не было ў нашай гісторыі (Звязда 18.10.16, с. 11).

У часткі насельніцтва Беларусі пра шляхту як спецыфічны прывілеяваны клас насельніцтва ў мінулыя часы, які ў асобныя перыяды нашай дзяржавы дасягаў 20 працэнтаў ад усяго насельніцтва, склалася ўражанне, што шляхціцы жылі за кошт эксплуатацыі простага люду. Яны адрозніваліся празмернай ганарлівасцю, жыравалі за кошт эксплуатацыі сялянства, бавілі час у гульнях і зусім былі не ахвочыя да любой працы... Аднак гэта было не заўсёды так. Як піша *Святаслаў Асіноўскі*, шляхта як служылы клас пад час войнаў (а іх было даволі многа) са зброяй у руках павінна была ў любыя часы абараняць Радзіму. Шляхціцы першымі абавязаны былі скласці галаву за караля, вялікага князя і свой народ... Шляхецкі гонар і пустая ганарлівасць — далёка не адно і тое ж. На жаль, якраз шляхецкага, рыцарскага гонару і не хапае многім з нас. Вось тут бы нам і павучыцца ў лепшых прадстаўнікоў шляхецкага роду [2, 69].

Вядома, што беларускія прозвішчы характарызуюцца стракатасцю з пункту гледжання іх словаўтваральнага складу. Большасць з іх утворана пры дапамозе спецыфічных анамастычных суфіксаў *-оў / -аў / -яў / -ёў, -іч / -ыч, -овіч / -евіч / -эвіч, -ін / -ын, -енка / -энка / -анка, -еня / -эня, -ёнак / -онак, -ук, -юк,* якімі выразна падкрэсліваецца нацыянальная ідэнтыфікацыя іх носьбітаў*: Чыгрынаў, Барвенаў, Лунёў, Васіленка, Пятрэнка, Пішчанка, Міцкевіч, Кавалевіч, Дарашэвіч, Гаўрыловіч, Выдрыч, Руновіч, Мацулевіч, Колас, Кулак, Богдан, Вакульчык, Серада, Лось, Сокол, Стральчэня, Шупеня, Кляўчэня, Плаксёнак, Пісаронак, Кавалёнак, Трафімук, Клімчук* і інш. Такія адзінкі, асабліва за межамі нашай радзімы, выразна выдзяляюць беларусаў гэтымі асаблівасцямі сярод іншых народаў, у радзе выпадкаў нават "падказваюць", з якіх рэгіёнаў Беларусі мог быць носьбіт пэўнага прозвішча, кім былі яго продкі ў мінулым – простымі сялянамі, шляхтай і інш..

У класічнай працы М. Бірылы "Беларуская антрапанімія: уласныя імёны, імёны па бацьку, прозвішчы" (Мн., 1969) засведчана, што ў XVI ст. прозвішчаў беларусаў на *-овіч (-віч)*, утвораных ад імёнаў па бацьку, было 83 %, а на *-ов (-ев)* – 1,75 %, на *-ін* – 1,63 %, а ў наш жа час, як сведчаць сучасныя даследаванні, імёнаў тыпу *Вярхоў, Кісялёў, Адамаў* 24 %, а прозвішчаў на *-ін (-ын)* тыпу *Пысін, Івашын* 7,88 %, што з'яўляецца пераканальным вынікам істотнага экстралінгвістычнага ўздзеяння рускага антрапанімікону на беларускі. Дарэчы, такіх некалі вельмі пашыраных і вядомых на беларускім этнаграфічным арэале прозвішчаў (*Кавалевіч, Казакевіч, Івановіч, Васілевіч, Хадкевіч, Пяткевіч, Міцкевіч, Аляксандровіч, Ярмаловіч, Караткевіч* і інш.) цяпер усяго 4102 (7,3 %).

Прозвішчы з фармантамі *-овіч, -евіч, -іч, -ыч* бытуюць ва ўсіх кутках Беларусі, але найбольш тыповыя яны для цэнтральнай часткі і *Гродзеншчыны.* Параўнаем таксама: *К. Міцкевіч (Я. Колас), І. Луцэвіч (Я. Купала), Ф. Багушэвіч, В. Дунін-Марцінкевіч, Н. Гілевіч, Я. Непачаловіч, У. Юрэвіч, М. Ермаловіч, А. Марціновіч, Г. Далідовіч, М. Багдановіч* і інш. Гэтая мадэль беларускіх прозвішчаў, як сведчаць даследчыкі, аказала ўплыў на фарміраванне падобных прозвішчаў у польскай і рускай мовах, якія там атрымалі значнае пашырэнне ў XVIII і наступных стагоддзях.

Такім чынам, прозвішча *Станкевіч* – семантычна празрыстае: утворана суфіксальным спосабам, у яго аснове гутарковы варыянт дахрысціянскага мужчынскага імя *Станіслаў (Станек, Стась)* плюс фармант-суфікс *-евіч*. Яно тыпова беларускае. Ад імя *Станіслаў*, як сведчаць навуковыя даведнікі, утвораны наступныя беларускія прозвішчы: *Станевіч, Станік, Станілевіч, Станіш, Станкоў, Станкевіч, Станчыц, Станчук, Станчык, Endnote, Станюш, Станчыс, Стась, Стаселька, Стасет, Стасюк, Стасюкевіч, Стасюлевіч, Стэсін, Стэсік, Стасоўскі, Станіслаўскі, Станішэўскі, Станкоўскі.* Мадэль на *-овіч, -евіч* лічылася сацыяльна падвышанай, шляхецкай, у мінулыя часы была дамінуючай у антрапаніміі беларусаў. Даследчыкі беларускага антрапанімікону адзначаюць, што найменні на *-овіч, -евіч* у ВКЛ маглі мець прадстаўнікі ўсіх слаёў грамадства (XV–XVIII стст.), але былі найчасцей уласцівы шляхце, спачатку яны ўяўляліся

МГПУ им. И.П. Шамякина

ў якасці імёнаў па бацьку, а ў суседняй Маскоўскай дзяржаве ім надавалася толькі саслоўнае, шляхецкае (дваранскае) сацыяльна падвышанае значэнне (М. Бірыла, Г. Усціновіч).

Такія антрапонімы ўжываліся і ўжываюцца ў наш час у палякаў, але ў польскай мове, як адзначыў Ф. Янкоўскі, яны спрадвечна канчаліся на *-іц*, як і словы *печ, ноч.* У палякаў жа гэта былі прозвішчы пераважна простага люду. З XVI–XVII стст. некаторыя прозвішчы на *-іч*: у польскай мове сталі гаварыць і пісаць *Chodrieicz, Szymonowicz, Klenowicz* і інш. [3, 300]. Спрацоўвала, відаць, лінгвістычная аналогія, такія прозвішчы ў нашых заходніх суседзяў "облагораживались", бо які просты польскі селянін не марыў стаць шляхціцам, падпраўляючы сваё прозвішча на такі ўзор. Параўн.: вядомыя ў мінулыя часы прозвішчы беларускай шляхты: *Адамовіч, Міцкевіч, Абрамовіч, Данілевіч, Захарэвіч, Сташкевіч, Тамковіч.* Падпраўляюць і цяпер некаторыя беларусы свае прозвішчы, але ўжо часцей на ўзор тыповых рускіх анамастычных узораў: *Калеснік – Калеснікаў, Чыгрын – Чыгрынаў, Кулеш – Куляшоў і* г. д. У часы маладосці пісьменніка Я. Коласа яго ўласнае прозвішча *К. Міцкевіч*, а таксама створанае ім прозвішча галоўнага персанажа трылогіі "На ростанях" (Лабановіч) успрымаліся ў грамадстве як сацыяльна падвышаныя. Пра гэта, напрыклад, сведчаць успаміны пісьменніка Міколы Лобана, які пісаў: *Кажуць, калі яго дзед Васіль* (*пісьменніка* – В. Ш.) *першы раз пайшоў у школу, настаўнік запытаў: "Як прозвішча?" – "Лабановіч", – адказаў хлапчук. "Як – Лабановіч? Мужык ды шляхецкае прозвішча носіш? Лобан тваё прозвішча", запярэчыў настаўнік і запісаў: "Лобан Василий"* [4, 98].

Яшчэ прыклад. З XVII стагоддзя ў многіх краінах Еўропы ведалі выдатнага вучонага-беларуса *Казіміра Семяновіча*, які ўпершыню ў свеце распрацаваў тэорыю стварэння шматступеннай ракеты, абессмяроціў сваё імя стварэннем многаступянёвых ракет тыпу "дэльта" і іншымі вынаходніцтвамі ў галіне артылерыі і ракетнай тэхнікі. Яго імя доўгі час прыпісвалі іншым народам. Аднак арфаграфічная адметнасць блізкіх па гучанні беларускіх і польскіх прозвішчаў блытала, а часам і, наадварот, дазваляла даследчыкам праз стагоддзі ўносіць карэктывы адносна паходжання носьбіта прозвішча. Так, даследчыкі мінулага спрабавалі далучыць гэтага таленавітага чалавека да палякаў ці літоўцаў. Аднак А. Бельскі і М. Ткачоў, адшукаўшы звесткі з радаслоўнай, а таксама выкарыстаўшы асаблівасці напісання прозвішча самім К. Семяновічам, паказалі, што знакаміты вучоны і вынаходнік шматступеннай ракеты быў не палякам і не літоўцам, а беларусам. "Дакументы, якія захаваліся з XVII ст., – адзначаюць даследчыкі, – асабліва напісаныя рукою самога К. Семяновіча, даюць правапіс прозвішча ў гучанні таго часу як Siemienowicz (Семеновіч). У дакументах жа кароннай артылерыі яно часам перайначваецца на польскі манер – "Siemionowic" (Семёновіц). Варыянт Siemjonowicz (Сем'ёновіч) не сустракаецца. Натуральна, што сапраўдны правапіс свайго прозвішча ведаў найперш сам вучоны. Гэта адназначна, і таму ў гісторыі сусветнай навукі назаўсёды застанецца прозвішча, якое ён сам ужываў" [5, 16].

Дарэчы, спалучэнне антрапонімаў *Станкевіч Аляксандра Аляксандраўна*, на нашу думку, даволі ўдалае. Менавіта асабовае ўласнае імя ў сукупнасці з прозвішчам дазваляе ідэнтыфікаваць асобу з усяго калектыву, выдзеліць яе з людской супольнасці. Вартасць шляхецкага прозвішча памацняецца ўласным імем *Аляксандра* або яго шматлікімі варыянтамі (*Саша, Шура, Алеся, Сашуля, Шурка, Аля, Алька, Ася, Аляксандарка, Лекса, Ляксана, Ляксаня, Ляксаша* і інш.). Яно вядомае ў англійскай, італьянскай, балгарскай, венгерскай, іспанскай, нямецкай, славацкай, французскай і інш. мовах. Утворана яно ад грэч. *Alexandros: alexo* – абараняць і *Andros* – муж, мужчына. У народзе замацавалася яго этымалагічная версія – *правадыр*. Ад гэтага імя ўтвораны наступныя прозвішчы: *Аляксандраў, Александровіч, Аляксанкін, Алесь, Алесіч, Алесенка, Алесік, Алеська, Аляксюк, Аляхно, Аляхновіч, Алікевіч, Альковіч, Лесь, Лесін, Лесік, Леська, Ліксандра, Ляско, Лясюк, Санаў, Санін, Санец, Санцэвіч, Санька, Санько, Санковіч, Санчук, Санюта, Сашанок, Сашко, Сашчанка, Сашанькін* [6, 23]. У сусветнай гісторыі такая парадыгма *"уласнае імя Аляксандр(а) + прозвішча"* стала свайго роду шаблонам, усталяваным стэрэатыпам: *Аляксандр Македонскі, Аляксандр Неўскі, Аляксандр Сувораў, Аляксандр Пушкін, Аляксандр Дзюма, Аляксандр Блок, Аляксандр Твардоўскі, Аляксандр Салжаніцын* – такія імёны гавораць пра многае. Натуральна дапаўняе гэты рад яго культуралагічны аспект. Ад гэтага імя ўтвораны шматлікія айконімы: *Александрыя, Аляксандраўка, Александропаль, Аляксандраў Гай* і інш. Дарэчы, імя *Аляксандра*, яго варыянт *Алеся* ў мове беларусаў праз спецыфічную метафарызацыю сімвалізавалася: у самы складаны перыяд вайны 1941–1945 гг. трое энтузіястаў беларускай культуры – кампазітар *Яўген Цікоцкі*, паэт *Пятрусь Броўка* і спявачка *Ларыса Александроўская* – стварылі оперу *"Алеся"* (1943), якая славіла будучую Перамогу (Звязда. 2016. 19 кастр.). У гэтай сувязі варта адзначыць і верш А. Куляшова *"Алеся"*,

МГПУ им. И.П. Шамякина

а таксама беларускую песню-брэнд *“Алеся”* ў выкананні ансамбля *“Песняры”*, дзе гэта імя выступае як сімвал кахання, прыгажосці.

І. Каралёва – аўтар *“Словаря фамилий Смоленского края”* (Смоленск, 2006), спыняючыся на гісторыі прозвішчаў гэтага рэгіёна, дае тлумачэнне антрапонімам смаленскага дваранства, смаленскага шляхецтва, апісвае спосабы ўтварэння прозвішчаў смаленскай шляхты, іх родаў у гісторыка-культурным арэале. Падрабязна растлумачаны гэтай даследчыцай і прозвішчы з фармантамі *-овіч, -евіч*, што ўтвораны ад поўных і памяншальных формаў асабовых імёнаў, пераважна мужчынскіх. Усяго ёю выяўлена з розных крыніц гэтай мадэлі 63 адзінкі, што складае 25 % ад усіх прозвішчаў смаленскай шляхты, у ліку такіх і прозвішча *Станкевіч.* У гэтым наборы і такія смаленскія антрапонімы, вядомыя на Беларусі, як *Адамовіч, Аляхновіч, Багдановіч, Васілевіч, Мацкевіч, Пашкевіч, Станюкевіч, Стаховіч, Стацкевіч, Трахімовіч, Філіповіч, Цітовіч, Юркевіч, Яновіч* і інш. [7, 55–56]. Дарэчы, Смаленшчына – спрадвечна была беларускім рэгіёнам. Я. Шыраеў у кнізе “Русь Белая, Русь Черная и Литва в картах” (Минск, 1991) пісаў: “...Белоруссы составляли на конец XIX ст. наиболее распространенное племя в губернии; если принимать в расчёт и смешанный состав населения (великоруссов с белоруссами), то они оказываются во всех уездах, исключая уезды *Гжатский и Сычевский*; особенно же распространены в уездах *Рославском, Смоленском, Краснинском, Дорогобужском, Ельнинском, Поречьском и Духовщинском…* Вопреки этим фактическим данным политическая граница была проведена таким образом, что всё белорусское население Смоленщины оказалось отрезанным от Белоруссии и отошло к РСФСР” [8, 14].

Прозвішча *Станкевіч* належыць многім асобам, якія зрабілі значны ўнёсак у беларускую і сусветную навуку, культуру, вайсковую справу. У “Беларускай энцыклапедыі” (т. 15, Мн., 2002) засведчаны творчыя лёсы і біяграфіі больш за 10 асоб з прозвішчам *Станкевіч*, якія вызначаліся ў розных галінах дзейнасці.

1. *Станкевіч Адам Вікенцьевіч* – беларускі грамадска-палітычны дзеяч, выдавец, гісторык, публіцыст, літаратуразнавец, каталіцкі святар. Кандыдат кананічнага права.
2. *Станкевіч Аляксандр Андрэевіч* – праваслаўны царкоўны дзеяч, гісторык, публіцыст. Кандыдат багаслоўя. У 1860–1868 г. рэктар Полацкай духоўнай семінарыі. У 1886 г. епіскап балцкі.
3. *Станкевіч Антон Уладзіміравіч* – расійскі военачальнік. Генерал-маёр.
4. *Станкевіч Гемел Міхайлавіч* – Герой Савецкага Саюза. Скончыў Харкаўскае танкавае вучылішча.
5. *Станкевіч Іван Мікалаевіч* – вучоны ў галіне гісталогіі і фармакалогіі.
6. *Станкевіч Мікалай Уладзіміравіч* – расійскі грамадскі дзеяч, філосаф, паэт. Скончыў Маскоўскі ўніверсітэт. Спрыяў, як сведчаць даследчыкі, адкрыццю таленту паэта А. В. Кальцова, паўплываў на В. Бялінскага, У. Граноўскага, І. Тургенева і інш.
7. *Станкевіч Уладзімір Дзмітрыевіч* – беларускі рэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі.
8. *Станкевіч Янка (Ян Антонавіч)* – беларускі грамадска-палітычны і эміграцыйны дзеяч, мовазнавец, гісторык, перакладчык. Доктар славянскай філалогіі і гісторыі.

Дапаўняюць гэты спіс наступныя імёны, засведчаныя ў кнізе А. Пяткевіча “Людзі культуры з Гродзеншчыны” [9]:

9. *Станкевіч Станіслаў Восіпавіч* – беларускі грамадска-культурны дзеяч, літаратуразнавец, педагог, публіцыст. Доктар філалогіі (1936 г.).
10. *Станкевіч Станіслаў Лявонавіч* – беларускі паэт, выдавец, выйшлі зборнікі яго вершаў *“Смех не грэх”* (Вільня, 1926 г.), *“З майго ваконца”* (Вільня, 1928 г.).

У гэтым пераліку імёнаў выдатных асоб, безумоўна, засведчана таксама ў названых вышэй даведніках, а таксама ў энцыклапедыі “Беларуская мова” і *Станкевіч Аляксандра Аляксандраўна* – доктар філалагічных навук, прафесар, чыё імя добра вядома не толькі ў Беларусі, а і далёка за яе межамі. Моцныя крылы, старт у вялікую навуку дала, як пішуць пра *Аляксандру Аляксандраўну* яе вучні, паслядоўнікі, Наваградчына, беларуская Швейцарыя, узнёслая і паэтычная, зямля славутых *Адама Міцкевіча, Янкі Брыля, Барыса Кіта, Яфіма Карскага, Уладзіміра Калесніка* і інш. вядомых асоб. Зробленае прафесарам А. А. Станкевіч ва ўсходнеславянскім мовазнаўстве на высокім навуковым узроўні па-добраму здзіўляе: яе навуковыя інтарэсы звязаны з праблемамі сучаснай і гістарычнай лексікалогіі, літаратурнай і народна-дыялектнай моў, пытаннямі рыторыкі, стылістыкі, культуры маўлення, методыкі выкладання лінгвістычных дысцыплін, яна аўтар шматлікіх манаграфій, падручнікаў, рэдактар

МГПУ им. И.П. Шамякина

навуковых выданняў, рэцэнзент манаграфій, зборнікаў, кіраўнік вялікай навуковай школы прафесара А. Станкевіч, кіраўнік некалькіх рэгіянальных праграм па вывучэнні мовы, фальклору Мазырска-Прыпяцкага Палесся і Бранска-Гомельскага Пагранічча. Гэта далёка не поўны пералік тых накірункаў, добрых дасягненняў, поспехаў члена-карэспандэнта Беларускай акадэміі адукацыі, дырэктара Навукова-даследчага інстытута гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў пры ГДУ імя Ф. Скарыны А. А. Станкевіч. У нашым кантэксце асобна варта адзначыць, што ў 1968 г. прыгажуня-асістэнт кафедры беларускай літаратуры выпускніца-выдатніца Томскага ўніверсітэта Аляксандра Станкевіч сваю працоўную біяграфію пачынала ў Мазырскім педінстытуце, дзе яе і цяпер добра ведаюць, паважаюць і помняць за рэдкі талент, кампетэнтнасць, абаяльнасць, глыбокую эрудыцыю, якія ў ёй арганічна спалучаюцца з унутранай інтэлігентнасцю, вытанчанасцю. Яна, як падкрэсліваюць тыя, хто працаваў ці працуе побач з шаноўнай *Аляксандрай Аляксандраўнай* (Шурай, Алесяй), – надзвычай сціплы, тактоўны чалавек, таленавіты вучоны, мудры кіраўнік, бліскучы прамоўца, цікавы і глыбокі суразмоўца-субяседнік. А яшчэ, як сведчаць яе сямейнікі, яна клапатлівая мама і бабуля… На слыху многіх беларусаў і класічныя словы нашага нацыянальнага паэта Янкі Купалы, якія, мы лічым, будуць вельмі натуральнымі ў гэтым кантэксце: *“Кукавала зязюля / У зялёным лесе. / Гадавала матуля / Дачушку Алесю. / Кукавала зязюля / У зялёным лесе, / Не згадала матуля, / Што выйдзе з Алесі …”* На жаль, такіх унікальных асоб у наш час не так многа. Поспехаў Вам, будзьце і далей такой добрай, мудрай, прыгожай, якой мы бачылі і хочам бачыць Вас заўсёды!

**Вывады**

Такім чынам, у артыкуле на фоне беларускай нацыянальнай анамастыкі прасочаны этапы станаўлення прозвішча *Станкевіч* – тыповага для беларускага нацыянальнага антрапанімікону: на фоне іншых беларускіх прозвішчаў разгледжаны яго семантычныя і словаўтваральныя асаблівасці, названы асобы з гэтым прозвішчам, якія ўнеслі значны ўклад у беларускую і сусветную навуку, асвету, адукацыю, вайсковую справу, што надзвычай важна ў генеалагічным, лінгвагеаграфічным і культуралагічным аспектах.

СПІС АСНОЎНЫХ КРЫНІЦ

1. Тычына, М. Дарога ў глыб стагоддзяў: Летапіс вёскі Засмужжа Анатоля Статкевіча-Чабаганава / М. Тычына. – Роднае слова. – 2015. – № 10. – С. 85–87.
2. Асіноўскі, С. Там, дзе была Неўрыда / С. Асіноўскі. – Мінск : Выш. шк., 1996. – 165 с.
3. Янкоўскі, Ф. Беларуская мова / Ф. Янкоўскі. – 3-е выд., дапр. – Мінск : Выш. шк., 1978. – 336 с.
4. Шур, В. В. Анамастычная лексіка ў беларускай мастацкай літаратуры / В. В. Шур. – Мінск : “Тэхнапрынт”, 2002. – 226 с.
5. Бельскі, А. М. Вялікае мастацтва артылерыі / А. М. Бельскі, М. А. Ткачоў. – Мінск, 1992. – 163 с.
6. Усціновіч, А. К. Слоўнік асабовых уласных імён / А. К. Усціновіч ; пад рэд. А. А. Лукашанца. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 240 с.
7. Королёва, И. Словарь фамилий Смоленского края / И. Королёва. – Смоленск :СГТУ, 2006. – 300 с.
8. Ширяев, Е. Е. Русь Белая, Русь Черная и Литва в картах / Е. Ширяев. – Мінск : Навука і тэхн., 1991. – 119 с.
9. Пяткевіч, А. Людзі культуры з Гродзеншчыны / А. Пяткевіч. – Гродна : ГрДУ, 2000. – 365 с.

*Паступіў у рэдакцыю 16.03.17*

V. V. Shur

TYPICAL BELARUSIAN SURNAMES WHICH INCLUDES SUCH FORMANTS AS ***-ОВІЧ/-ЕВІЧ*** IN THE EAST SLAVIC ANTHROPONIMICS: LINGUISTIC AND CULTURAL ASPECTS

The article deals with the stages of formation of the surname *Stankevich*, which is typical of the Belarusian anthroponymy. It is very important not only in the genealogical aspect, but also in the linguocultural aspect. The author explains the origin of the surname, the wordformation, linguogeographical features, culturological peculiarities, the article mentions the personalities with this surname, who made a valuable contribution to science, education, military science.

Keywords: onym, anthroponym, surname, proper name, formant, onomastics suffix.

МГПУ им. И.П.Шамякина